**В. М. Бігеза,** *дацэнт кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы, кандыдат філалагічных навук,*
**С. В. Зыгмантовіч,** *загадчык кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# АДМЕТНАСЦІ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ ВА ЎМОВАХ ВУЧЭБНА-ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Завочнае навучанне сёння з’яўляецца адным з адносна даступных спосабаў павышэння кваліфікацыі, кампетэнтнасці, атрымання адукацыі рознага ўзроўню.

Адукацыя дарослых была названа ключом у XXI стагоддзе (Гамбург, 1997), і ў наш час гэта форма навучання атрымлівае прызнанне ва ўсіх краінах свету як адзін з важнейшых кірункаў інтэграцыі адукацыі з вытворчасцю, з’яўляючыся важнейшым кампанентам сістэмы бесперапыннай адукацыі.

Дзяржаўнай праграмай развіцця вышэйшай адукацыі на 2011–2015 гг. ставіцца задача аднаўлення прафесійнай адукацыі на кампетэнтнаснай аснове шляхам узмацнення практычнай накіраванасці прафесійнай адукацыі пры захаванні яе фундаментальнасці [1].

На нашу думку, адной з адметнасцей бібліяграфічнай падрыхтоўкі студэнтаў завочнага навучання з’яўляецца практыка-арыентаваная накіраванасць. У сістэме вышэйшай адукацыі існуе некалькі падыходаў да практыка-арыентаванай адукацыі. Адны аўтары (Ю. Ветраў, Н. Клушына) звязваюць яе з арганізацыяй вучэбнай, вытворчай і пераддыпломнай практыкі студэнтаў; іншыя (П. Абразцоў, Т. Дзмітрыенка) – неабходнасць яе ўкаранення бачаць у фарміраванні ў студэнтаў значымых для будучай прафесійнай дзейнасці якасцей асобы, а таксама ведаў, уменняў, навыкаў, неабходных у практычнай прафесійнай дзейнасці. Некаторыя аўтары (А. Вярбіцкі, А. Плотнікава, В. Шэршнева і інш.) станаўленне практыка-арыентаванай адукацыі звязваюць з выкарыстаннем магчымасцей кантэкстнага (прафесійна-накіраванага) вывучэння профільных і няпрофільных дысцыплін. Ф. Г. Ялалаў лічыць, што для пабудовы практыка-арыентаванай адукацыі неабходны новы, дзейнасна-кампетэнтнасны падыход [6]. Неабходна прызнаць, што ўсе названыя падыходы не з’яўляюцца

ўзаемавыключальнымі і могуць быць выкарыстаны ў рэалізацыі задач падрыхтоўкі сучасных бібліятэчных спецыялістаў.

Распрацаваны і прыняты адукацыйныя стандарты новага пакалення для падрыхтоўкі спецыялістаў па спецыяльнасці «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» [2], тыпавыя вучэбныя планы, а таксама праграмы вучэбных дысцыплін пабудаваны як раз на сучасных метадалагічных пазіцыях з улікам рэалізацыі дзейнасна-кампетэнтнаснага падыходу.

Разам з тым, нягледзячы на наяўнасць нарматыўна-рэгламентуючых дакументаў, асэнсаванне прымянення кампетэнтнаснага падыходу да падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў у навуковых публікацыях [3], студэнты-завочнікі не выступалі прадметам спецыяльнага вывучэння ў кантэксце практыка-арыентаванай адукацыі. Гэта можна растлумачыць іх паглыбленасцю ў вытворчую сферу ў большай ступені, чым у навучальны працэс, сфарміраванасцю прафесійнага мыслення і матывацыяй вучэбнай дзейнасці. З другога боку, неабходна таксама ўлічваць і вузкасць іх спецыялізацыі ў прафесійнай дзейнасці. Што датычыцца бібліяграфічнай падрыхтоўкі, то сярод студэнтаў ФЗН рэдка сустракаюцца тыя, хто займае пасады бібліёграфа, хаця менавіта бібліяграфічная функцыя з'яўляецца скразной для работы ўсіх падраздзяленняў бібліятэкі і кожны выпускнік факультэта павінен умець на практыцы рэалізоўваць бібліяграфічныя функцыі.

Практыка-арыентаваная бібліяграфічная падрыхтоўка студэнтаў завочнага навучання адбываецца праз спалучэнне фундаментальнай адукацыі, прафесійна-прыкладной падрыхтоўкі шляхам засваення спецыяльных дысцыплін, дысцыплін спецыялізацый, курсаў па выбару.

Практыка-арыентаваны характар выкладання спецыяльных дысцыплін, дысцыплін спецыялізацый знаходзіць сваё адлюстраванне ў формах навучання. Акрамя лекцый, семінарскіх, традыцыйных лабараторных і практычных заняткаў, усё больш выкарыстоўваюцца такія актыўныя формы, як ролевыя і дзелавыя гульні, трэнінгі, рашэнне вытворчых задач, дыялогава-дыскусійныя метады, навучанне ў парах, падрыхтоўка мерапрыемстваў для канкрэтных мэтавых груп карыстальнікаў, індывідуальныя заданні, арыентаваныя на стымуляванне як інтэлектуальнага, так і асобаснага станаўлення студэнтаў.

Змястоўная трансфармацыя навучальнага працэсу, арыентаваная на развіццё студэнта, прадугледжвае не толькі знаёмства, засваенне зместу пэўных вучэбных дысціплін, але і актывізацыю яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

самастойнай пазнавальнай дзейнасці. Важнасць самастойнай работы студэнтаў (СРС) у значнай ступені абумоўлена скарачэннем колькасці аўдыторных заняткаў, павелічэннем аб’ёму вучэбнага матэрыялу, растучым патокам інфармацыі і ўсвядомленай патрэбнасцю сучаснага грамадства ў гнуткіх адаптыўных сістэмах адукацыі, якія прадугледжваюць магчымасць павышэння кваліфікацыі, самаразвіцця на любым адрэзку жыццёвага шляху чалавека.

Новыя падыходы да арганізацыі СРС завочнай формы навучання, на нашу думку, прадугледжваюць разбор рэальных практычных сітуацый, узнікаючых у ходзе прафесійнай дзейнасці; працу з рознымі базамі інфармацыі; уменне крытычна мысліць і прымаць адказнасць за выбар рашэння; фарміраванне сваёй асабістай прафесійнай пазіцыі. Самастойная работа пры вывучэнні бібліяграфічных курсаў павінна садзейнічаць, на наш погляд, развіццю творчага патэнцыялу студэнта-завочніка. Заданні могуць насіць індывідуальны, групавы (2–3 студэнты) ці комплексны характар.

Нам бачыцца мэтазгоднай арганізацыя СРС у выглядзе сістэмы комплексных вучэбна-прафесійных заданняў. Такі падыход будзе садзейнічаць мадэліраванню рэальнай прафесійнай дзейнасці бібліятэкара-бібліёграфа.

Па нашым меркаванні, цікавай формай самастойнай работы студэнтаў пры вывучэнні бібліяграфічных дысцыплін з’яўляецца творчая работа малымі групамі. Мы выкарыстоўваем яе пры выкладанні курсаў «АТБР», «Бібліяграфія літаратуры для дзяцей і юнацтва», «Краязнаўчая бібліятэчна-бібліяграфічная дзейнасць дзіцячых бібліятэк». Група студэнтаў (2–3 чалавекі) выбірае прапанаваную тэму, вывучае яе на тэарэтычным і практычным узроўнях, а затым ідзе рознабаковае абмеркаванне вынікаў праведзенага даследавання на практычных занятках у выглядзе навукова-практычнай канферэнцыі, у ходзе якой выкладчык і студэнты задаюць пытанні, звязаныя з удакладненнем, практычным выкарыстаннем матэрыялу на рабочых месцах. Акрамя таго, выкладчыкамі кафедры прадугледжаны паглыблены аналіз навуковай літаратуры па тэмах бібліяграфічных курсаў: канспектаванне навуковай працы, складанне да яе анатацый ці рэцэнзій (супастаўленне розных пунктаў гледжання, пазіцыя аўтара і г.д.).

Як вядома, важнай крыніцай атрымання інфармацыі сёння становіцца Інтэрнэт. Як адзначаюць аўтары дапаможніка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Компетентностная модель современного педагога», «именно сеть, а не традиционная аудитория, все более становятся сферой диалога и обмена знаниями» [4, с. 95]. Мэтай арганізацыі СРС у Інтэрнэце з'яўляецца фарміраванне ўмення работы з навуковай літаратурай, аналізу лепшых сайтаў бібліятэк, а таксама знаёмства з іншымі разнастайнымі электроннымі рэсурсамі бібліятэк, якія дапамогуць пры выкананні самастойнай работы. Метадычная падтрымка работы студэнтаў у сетцы Інтэрнэт уключае адбор і арыентацыю студэнтаў на разуменне найбольш важных праблем знойдзенага матэрыялу.

Падкрэслім, што прадукты творчай і самастойнай дзейнасці студэнтаў могуць стаць дакументальнымі матэрыяламі для камплектавання прафесійнага партфоліа бібліятэкара.

Бяспрэчна важным аспектам у СРС з'яўляецца яе індывідуалізацыя, якая патрабуе ад выкладчыка папярэдніх кансультацый, яны павінны ўтрымліваць дакладную фармулёўку праблемы, складанне плана і вызначэнне шляхоў знаходжання неабходнай інфармацыі, што дапаможа студэнту ў самастойным аналізе і апрацоўцы сабранага матэрыялу.

Намі прадугледжаны асноўныя формы кантролю СРС, сярод якіх – вусныя групавыя калёквіумы па тэматычных блоках курсаў, выкананне пошукавых заданняў на падставе традыцыйных крыніц і Інтэрнэт-рэсурсаў, пісьмовыя заданні з выкарыстаннем метадаў навуковага даследавання, абарона курсавых і дыпломных работ і інш.

Вывучэнне разглядаемага пытання СРС адносна бібліяграфічных дысцыплін дае нам падставу сцвярджаць, што павелічэнне аб'ему СРС разглядаецца сёння як пазітыўная тэндэнцыя ў вышэйшай адукацыі і як закладанне прафесійных асноў, звязанае з задачай навучыць бесперапынна вучыцца і развівацца самастойна ў прафесійным і асобасным кірунках. Арганізаваная выкладчыкам самастойная работа студэнта дазваляе зрабіць адукацыйны працэс больш прадуктыўным, творчым і асобасна-арыентаваным.

Разам з тым адзначым, што, нягледзячы на ўскладненне бібліяграфічнай практычнай дзейнасці, аб'ём вучэбных заняткаў па спецыяльных бібліяграфічных дысцыплінах, дысцыплінах спецыялізацый скарочаны да мінімуму. Фармальны падыход да планавання вучэбнага працэсу прыводзіць да таго, што выкладчыкі аб'ектыўна не маюць магчымасці рэалізаваць пэўныя задачы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вучэбных праграм і сфарміраваць у студэнтаў абазначаныя ў праграмах кампетэнцыі.

Актуальнай праблемай для студэнтаў-завочнікаў, якія не працуюць па спецыяльнасці, з’яўляецца арганізацыя азнаямляльнай і вытворчай практык, якія не ўключаны ў новыя вучэбныя планы.

Асобай увагі патрабуе і распрацоўка вучэбнай, вучэбна-метадычнай дакументацыі па бібліяграфічных курсах у дапамогу студэнтам-завочнікам. Сёння па многіх бібліяграфічных курсах маюцца выдадзеныя вучэбныя дапаможнікі, электронныя вучэбна-метадычныя комплексы, якія ў большай ступені арыентаваны на фарміраванне ведавага кампанента навучэнцаў. Для рэалізацыі ж практыка-арыентаванага падыходу ў працэсе самастойнай міжсесійннай работы студэнты-завочнікі павінны таксама абапірацца на багаты вучэбна-дыдактычны матэрыял у форме кантрольных пытанняў для самаправеркі па асноўных тэмах чытаемых курсаў, на выкананне тэставых заданняў, рашэнне вытворчых сітуацый, выкананне практычных заданняў, аналіз бібліяграфічнай практыкі канкрэтных бібліятэк і г.д. з адпаведнай кансультацыйнай і кантралюючай падтрымкай з боку выкладчыкаў.

Эфектыўнасці самастойнай пазнавальнай дзейнасці студэнтаў будзе садзейнічаць таксама ўдасканальванне сістэмы інфармацыйных камунікацый ва ўніверсітэце, якія адкрываюць доступ да найноўшых дасягненняў сусветнага згуртавання, вучэбных планаў па змесце і логіцы праходжання дысцыплін. Распрацоўка і ўкараненне новых форм і метадаў кантролю за СРС, модульна-рэйтынгавы падыход у ацэнцы якасці ведаў студэнтаў-завочнікаў таксама плануецца здзяйсняць з больш шырокім выкарыстаннем новых інфармацыйных тэхналогій.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

*1. Об утверждении* Государственной программы развития высшего образования на 2011–2015 годы : постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 1 июля 2011 г., № 893. – URL : http : // pravo.by.

*2. ОС РБ 1-23 01 11-2008.* Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. *Спецыяльнасць* Е 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках). *Кваліфікацыя* Бібліятэкар-бібліёграф. – Узамен РД РБ 02100.5.211-98; уведз. 12.06.2008. – URL : http : //www.edubelarus.info.

*3. Зыгмантовіч, С. В.* Прафесійная падрыхтоўка будучых бібліятэкараў: кампетэнтнасны падыход / С. В. Зыгмантовіч // Весн. БДУ культуры. – 2005. – № 2. – С. 101–107 ; Елепов, Б. С. Компетентность и компетенции библиотечного специалиста : как и зачем их оценивать / Б. С. Елепов, Е. М. Крючкова // Библиотековедение. – 2009. – № 3. – С. 115–134; Яцевич, Н. А. Компетентностный подход к подготовке

специалистов по АБИС / Н. А. Яцевич. – URL : www. nbuv. gov. ua/articles/ crimea/ 2007/174.pdf.

*4. Компетентностная* модель современного педагога. – СПб.: Изд-во РГПУ, 2009. – 158 с.

*5. Лобанов, А. П.* Управляемая СРС в контексте инновационных технологий / А. П. Лобанов. – Минск : РИВШ, 2005. – 87 с.

*6. Ялалов, Ф. Г.* Деятельностно-компетентностный подход к практико-ориентированному образованию / Ф. Г. Ялалов. – URL : http : //www. eidos.ru/journal/2007/0115 – 2.htm.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ